Если сравнивать с ВНС Всебелорусский съезд и Народное собрание Западной Беларуси, то два последних института наиболее схожи с первым ВНС. Созванные для определения принципов дальнейшего развития белорусской государственности форумы народовластия имеют в основном учредительный характер и стали поворотными моментами в истории Беларуси.

Таким образом, демократизм белорусского государства имеет обширные исторические координаты. ВНС является уникальным национальным опытом правового регулирования. Созвав первое ВНС для решения конкретной проблемы, белорусское общество институционализировало Всебелорусские народные собрания и превратило первоначально консультативный институт в демократическую обыденность, дав фору в конституционном развитии и обеспечении демократии ведущим мировым державам.

***Духнова К. А.***

## ГЕОРГІЙ КАНІСКІ: УДЗЕЛ У ЗАХАВАННІ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАСЦІ

*Духнова Карына Аляксандраўна, магістрантка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, karinaduhnova@gmail.com*

*Навуковы кіраунік: канд. юрыд. навук, дацэнт Голубева Л. Л.*

Прэамбула Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацоўвае шматвяковую гісторыю развіцця беларускай дзяржаўнасці, захаванне нацыянальнай самабытнасці, таму менавіта зараз неабходна даследаваць, як развівалася беларуская дзяржава, якія дзеячы паўплывалі на фармаванне народнасці, звяртацца да гісторыі.

Адной з самых вострых праблем палітычнага жыцця Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. з'яўлялася праблема дысідэнтаў. Яе з'яўленне звязана з прыняццем на сойме 1733 г. закона, які забараняў асобам некаталіцкага веравызнання займаць дзяржаўныя пасады, абіраць і быць абраным у Вальны сойм Рэчы Паспалітай. Гэты закон у якасці дапаўнення ўвайшоў у Статут 1588 г. і такім чынам распаўсюджваўся на тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага. У ходзе барацьбы за ўраўнаванне ў правах дысідэнтаў з каталікамі вылучаўся шэраг вядомых палітычных мысліцеляў, адным з якіх з'яўляецца Георгій Каніскі. Г. Каніскі не з'яўляўся праціўнікам ні феадальна-прыгонніцкага ладу, ні рэлігіі. Ён патрабаваў толькі паслаблення феадальнай эксплуатацыі, згладжвання найбольш вострых супярэчнасцей, зацвярджэння ў сучасным яму грамадстве, «элементарнай законнасці» ў канчатковым рахунку ў інтарэсах саміх жа памешчыкаў. Яго ідэалам быў «адукаваны» і «добры» кароль, справядлівы суддзя, нежорсткі землеўладальнік, паслухмяны селянін. Ён звязваў грамадскі працэс з развіццем навукі з распаўсюджваннем адукацыі на ўсе слаі насельніцтва і энергічна праводзіў у жыццё свае ідэі: адчыняў школы і семінарыі, пісаў і выдаваў навуковыя і мастацкія творы, крытыкаваў крайнасці феадалізму, жорсткую эксплуатацыю і прыгнёт народа, невуцтва, духоўную галечу тых, хто мае ўладу.

Г. Каніскі прапагандаваў неабходнасць скасавання феадальнай анархіі і абмежавання самавольства феадалаў, усталявання ў краіне цэнтралізаванага

парадку і законнасці. Ён быў ідэолагам сярэдніх слаёў пануючага класа сучаснага яму грамадства, якое было зацікаўлена ў абмежаванні магутнасці буйных феадалаў, упарадкаванні дзяржаўнай улады, развіцці асветы. Гэтыя погляды супадалі з інтарэсамі новага класа, што нараджаўся ў той час, – класа буржуазіі, які нёс ідэалогію Асветніцтва.

Такім чынам, дзякуючы сваім выдатным якасцям, Георгій Каніскі апынуўся здольным вырасці з біскупа епархіі ў паўнамоцнага прадстаўніка ўсяго заходнерускага праваслаўя, стаўшы кіраўніком ўсіх польскіх дысідэнтаў, змагаром і абаронцам свабоды сумлення, актыўным праваднікам у Польшчы знешняй палітыкі рускага ўрада. Менавіта яму Беларусь абавязана захаваннем сваёй веры і народнасці, а затым і поўным вызваленнем ад двухвекавога мяцежнага польскага прыгнёту.

***Наважэн К. Д.***

## ПАРАЎНАЛЬНА-ПРАВАВЫ АНАЛІЗ АБ'ЕКТЫЎНАГА БОКУ ЗЛАЧЫНСТВА ПА СТАТУТУ ВКЛ 1588 г. І САБОРНАМУ ЎЛАЖЭННЮ 1649 г.

*Наважэн Крысціна Дзмітрыеўна, студэнтка 3 курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, г. Мінск, Беларусь, law.novozhen@bsu.by*

*Навуковы кіраўнік: канд. юрыд. навук, дацэнт Голубева Л. Л.*

Статут ВКЛ 1588 г. і Саборнае Ўлажэнне 1649 г. – найважнейшые помнікі заканадаўства. У іх замацаваны віды злачынстваў і пакаранняў, але яшчэ недастаткова дакладна сфарміраваны інстытуты агульнай часткі крымінальнага права, у прыватнасці, інстытут складу злачынства.

Пры характарыстыцы злачыннага дзеяння ў феадальны час першапачаткова варта звярнуцца да тэорыі сучаснага крымінальнага права, якое вылучае чатыры прыметы складу злачынства: аб'ект, аб'ектыўны бок, суб'ект, суб'ектыўны бок.

Шмат аўтараў, якія вывучалі заканадаўства таго перыяду, у сваіх працах амаль не характарызавалі склады злачынства, а толькі называлі іх. У сувязі са станам вывучанасці праблемы неабходна больш падрабязна спыніцца на параўнальнай характарыстыцы інстытута аб'ектыўнага боку злачынства, які змяшчаецца ў Статутах ВКЛ і Саборным Улажэнні 1649 г.

Сукупнасць прымет, якія характарызуюць злачынства, складаюць яго аб'ектыўны бок. У сучасным крымінальным праве гэта паняцце ўключае ў сябе грамадска небяспечнае дзеянне, прычынную сувязь паміж дзеяннем і наступіўшымі грамадска небяспечнымі вынікамі, а таксама месца, спосаб, час і абставіны здзяйснення злачынства, але варта памятаць, што абавязковай прыметай з'яўляецца толькі грамадска небяспечнае дзеянне, астатнія прыметы – факультатыўныя.

Усе гэтыя асаблівасці ў той ці іншай ступені знайшлі адлюстраванне ў заканадаўстве ВКЛ, але найбольш дэталёва ў Статуце 1588 г. Паводле Статута злачынствы маглі быць здзейснены ў форме актыўнага дзеяння, а таксама ў форме ўстрымання ад дзеяння. Злачыннае дзеянне не абмежавана